УДК 745.522.1

# МІНІТЭКСТЫЛЬ У ВІЦЕБСКУ

***Лісоўская Н.С., доц.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Реферат. *У артыкуле разгледзены куратарскі праект "Мінітэкстыль", спалучэнні розных матэрыалаў у тэкстылі, асаблівасці твораў беларускіх аўтараў, традыцыі і навацыі ў мінітэктылі.*

Ключавыя словы: мінітэкстыль, біенале, мастацкі тэкстыль, Віцебскі мастацкі музей.

У Віцебскім тэхналагічным інстытуце легкай прамысловасці ў 1975 годзе была адкрыта спецыянальнасць "Мастацкае афармленне і мадэліраванне вырабаў тэкстыльнай і легкай прамысловасці" са спецыялізацыяй "Мастацкае афармленне тэкстыльных вырабаў спосабам ткацтва". З той пары ў выставачных залах Віцебска праходзіць шмат тэкстыльных праектаў. У 2009 годзе ў Цэнтры сучаснага мастацтва адбылася рэспубліканская выстава «Беларускі тэкстыль», дзе куратарамі з'яўляліся старшыня секцыі мастацкага тэкстылю Беларускага саюза мастакоў Густава Ларыса Мікалаеўна і сябра БСМ Лісоўская Наталля Сяргееўна. З гэтага праекта пачаліся рэспубліканскія біенале мастацкага тэкстылю ў Віцебску. Ў 2019 годзе выстава "Яднанне" ужо была міжнароднай, дзе ўдзельнічалі мастакі з Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Украіны.

З 10 па 29 студзеня 2020 года ў Віцебскім мастацкім музеі працаваў куратарскі праект Вольгі Рэднікінай "Мінітэкстыль", які ў лістападзе 2019 года быў прадстаўлены ў Мінску ў Палацы мастацтва. Мінітэкстыль зараз вельмі папулярны: ў розных краінах свету праводзіцца шмат выстаў, у якіх прымаюць удзел мастакі з Беларусі: ў Расіі, Літве, Польшчы, Украіне, Славакіі і г. д. Асобныя творы камернага фармату былі ў тэкстыльных экспазіцыях і раней, але выставы мінітэкстыля даўно не праводзіліся ў Беларусі, таму гэты праект аказаўся своечасовым і неабходным. Мы думаем аб забяспячэнні пераемнасці традыцый мастацкага тэкстылю і прыцягненні творчай моладзі да выставачнай дзейнасці, таму акрамя прафесійных мастакоў, сябраў БСМ у праекце прымалі ўдзел і студэнты мастацкіх устаноў Беларусі. Таксама былі запрошаны мастакі аб'яднання "Колаарт" з украінскага горада Роўна.

У Віцебску іншая выставачная прастора, таму і экспазіцыя ўспрымалася па-новаму: творы, выкананыя ў традыцыйнай тэхніцы ручнога ткацтва і побач арт-аб'екты з лямцу, з абкруткай. Мастакі працуюць з рознымі матэрыаламі: традыцыйныя воўну, бавоўну і лен спалучаюць са шклом, керамікай, дротам, паперай, металам, бурштынам, сізаллю, дрэвам, пластыкам, фатаграфіямі, сінтэтыкай і ў розных тэкстыльных тэхніках: ручное ткацтва, пляценне, валянне, лічбавы друк, калаж, вышыўка, аплікацыя, выцінанка. У экспазіцыі 62 творы 35 аўтараў розных гадоў: Арайс Анастасіі, Бартлавай Валянціны, Белавусавай-Пятроўскай Таццяны, Высоцкай Хрысціны, Гуршчанковой Антаніны, Крываблоцкай Галіны, Крывашэевай Валянціны, Каньковай Наталлі, Лісавенка Ўладзіміра, Лісоўскай Наталлі, Пілюзінай Ніны, Пятруль Людмілы, Сакаловай–Кубай Яніны, Рэднікінай Вольгі, Шчамялевай Маргарыты і інш.

Беларускія мастакі-тэкстыльшчыкі паважаюць традыцыю – шмат твораў, выкананых у класічнай тэхніцы ручнога ткацтва: гэта "Год" Крываблоцкай Г., "Замак у Міры" Пілюзінай Н., "Волаты" Чуглазавай Т.,"Міхта" Непачаловіч А.,"Птушка ў горадзе" Крывашэевай В., "Лета" Бартлавай В.,"Рыбкі на сподачку", "Се чалавек","Зімовы хутарок" Лісавенка Ў.(мал. 1, 2). Мастакі таксама выкарыстоўваюць і іншыя тэхнікі народнага ткацтва, напрыклад, ткацтва на бярдзечку, ручное выбарнае ткацтва.



Малюнак 1 а – Пілюзіна Н., "Замак у Міры", 1985 г., воўна, ручное ткацтва



Малюнак 1 б – Крываблоцкая Г. З паліпціха "Год", 1994 г., воўна, ручное ткацтва



Малюнак 2 а – Лісавенка Ў. "Рыбкі на сподачку", 2012 г., воўна, ручное ткацтва



Малюнак 2 б – Чуглазава Т. "Волаты", 2012 г., лен, бавоўна, ручное ткацтва

Помнікі архітэтуры, прырода, міфалогія Беларусі, архаіка натхняюць аўтараў на стварэнне як пласкастных кампазіцый: "Краявід" Сакаловай–Кубай Я., так і рэльефных, і аб'емных: "Кветкавая касмагонія" Гуршчанковай А., "Дрэўца", "Белы сад" Фаміной Т., Круковіч А. "Паветра вясны", "Папараць-кветка" Лісоўскай Н., "Рунныя камяні", "Прабуджэнне" Амельчанка С. (мал. 3). Тэма чысціні асяроддзя хвалюе сучасных мастакоў: "Без ГМА" Высоцкай Х., "Кроплі. Зберажом" Лісоўскай Н., а таксама сямейныя каштоўнасці: "Сем разоў адмеранае я" Гомза Т.



Малюнак 3 а – Фаміна Т. "Дрэўца", 2019 г., лен, вузялковае пляценне



Малюнак 3 б – Круковіч А. "Паветра вясны", 2019 г., сінтэтыка, пластык

Сярод арт-аб'ектаў, выкананых у тэхніцы валяння, асабліваю ўвагу прыцягваюць творы "Метафара", "Вугаль" Арайс А., Амельчанка С. "Лесвіца"(мал. 4).



Малюнак 4 а – Арайс А. “Метафара”, 2017 г., воўна, шкло, валянне



Малюнак 4 б – Амельчанка С. “Лесвіца”, 2019 г., папера, воўна, валянне



Малюнак 5 а – Лісоўская Н. “Памятайце!”, 2018 г., воўна, метал, ручное ткацтва



Малюнак 5 б – Экспазіцыя выставы Мінітэкстыля

Гістарычная памяць дазволіла Лісоўскай Н. стварыць аб’ект “Памятайте!”, прысвячэнне весцы Марозаўка Сенненскага раена Віцебскай вобласці, спаленай фашыстамі разам з жыхарамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, загінулі 28 чалавек, у тым ліку 17 дзяцей.

У экспазіцыі выставы прадстаўлены творы markers рознай тэматыкі, розных гадоў, выкананыя ў розных тэхніках, з выкарастаннем розных матэрыялаў, нават не характэрных для тэкстылю. Побач з плоскаснымі кампазіцыямі – аб’екты з ўжываннем сучасных тэхналогій, напрыклад, лічвабага друку. Творы малых памераў дазваляюць мастаку знайсці новыя формы, нечаканыя мастацкія рашэнні (мал. 5).

Калі раней мастакі выкарыстоўвалі мінітэкстыль як эксперымент для твораў вялікіх памераў, то зараз мінітэктыль – гэта самастойны напрамак у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Трэба адзначыць, што сучасныя беларускія мастакі-тэкстыльшчыкі эксперыментуюць з матэрыяламі, тэхнікамі і прыёмамі, фарматамі, фактурамі, аб’емамі, не забываючыся на духоўную нацыянальную спадчыну, традыцыйныя каштоўнасці роднага краю.

УДК 745/749

## БЕЛОРУССКИЙ ВОЙЛОК

***Лисовская Н.С., доц., Грабовик Т.М., студ., Павлова В.С., студ.***

*Витебский государственный технологический университет, г. Витебск, Республика Беларусь*

Реферат. *В статье рассмотрены приемы и особенности создания войлока, традиционные и современные техники войлоковаляния, авторские работы художников.*